# ШЧОРСЫ ВІТАЛІ НАВУКОЎЦАЎ

✧ Год кнігі

***Напрыканцы мая ў Шчорсах адбыліся першыя Шчорсаўскія чытанні "Развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне. Дзяржаўныя і прыватныя зборы".***

Ідэя правядзення чытанняў выклікана абвяшчэннем Года кнігі ў Беларусі. І яшчэ тым, што Шчорсы ў 18-19 стагоддзях былі сапраўдным культурным цэнтрам са знакамітай на абшарах былога Вялікага Княства Літоўскага бібліятэкай. У ёй у розныя часы захоўвалася ад 9 да 20 тыс. кніг, манускрыптаў, рукапісаў, карт. Мелася калекцыя археалагічных знаходак, калекцыя карцін. Сам маёнтак прыцягваў дасканалымі архітэктурнымі формамі, прыгожым пейзажным паркам і ўнікальнай аранжарэяй. Ды і сёння Шчорсы - гэта маляўнічы, прыгожы куток, дзе пануе дух шляхетнасці і інтэлігентнасці, дзе моцная гаспадарка і гасцінныя людзі, якія для ўдзельнікаў чытанняў стварылі атмасферу свята. Дарэчы, мясцовы СВК "Шчорсы" выступіў спонсарам мерапрыемства. Вялікі дзякуй за гэта.

Ва ўрачыстай абстаноўцы навагрудчане віталі навукоўцаў з Гродна, Беластока, Мінска. З прывітальным словам да прысутных звярнулася намеснік старшыні райвыканкама А.Я. Ермакова.

Пазней увага ўсіх выступаючых акцэнтавалася на ролі Іаахіма Храптовіча ў асветніцкіх працэсах і сацыяльна-гаспадарчых увядзеннях. Гаворка ішла аб першых медыцынскіх бібліятэках на Гродзеншчыне і першай публічнай бібліятэцы ў Навагрудку, якая размяшчалася ў будынку школы дамініканцаў. Вельмі цікавымі атрымаліся даклады аб ланкастэрскіх школах (адна з іх працавала і ў Шчорсах), аб фондах роду Сапегаў, першых газетах Навагрудчыны.

Госці наведалі рэшткі былога графскага палаца, царкву Дзмітрыя Салунскага і Свята-Елісееўскі манастыр.

Падчас чытанняў працавала выстава народна-прыкладнога мастацтва "Творчасць маіх землякоў". Прыцягвала ўвагу прысутных і галерэя інтэлектуальнай спадчыны "Шчорсаўскія скарбы", дзе дэманстраваліся кніжныя выданні, часопісы і фотаздымкі, прысвечаныя гісторыі Шчорсаў.

Дырэктар Гродзенскай абласной бібліятэкі Лідзія Мальцава адзначыла ў сваім выступленні, што Шчорсаўскія чытанні - значная падзея ў культурным жыцці Гродзеншчыны. Менавіта праз такія праекты бібліятэкі могуць шырока рэкламаваць сваю дзейнасць, пашыраць фонды каштоўнай літаратурай, даказаць, што нашы ўстановы з'яўляюцца ідэалагічным і сацыяльна-культурным капіталам нацыі. А дырэктар Беластоцкай ваяводскай бібліятэкі Ян Леанчук выказаў надзею, што фонды буйных бібліятэк Беларусі, Літвы, Польшчы стануць даступнымі любому жыхару нашых краін.

У будучым Шчорсаўскія чытанні вырашана праводзіць кожныя два гады. Разглядаецца пытанне аб прысваенні імя Іаахіма Літавора Храптовіча Навагрудскай цэнтральнай раённай бібліятэцы.

***І. ЦАРУК,***
***намеснік дырэктара цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.***